■ Невядомае пра вядомых

# ЯГО ПАЗНАВАЛІ ПА ГОЛАСЕ...

## «Жывое слова» знакамітага радыёдыктара

**Па першай адукацыі архітэктар, але па прызванні — дыктар, мовазнаўца, літаратурны крытык, дзіцячы пісьменнік. Уладзімір ЮРЭВІЧ каментаваў першы парад Перамогі ў вызваленым Мінску, калі горад яшчэ быў у руінах; больш як 40 гадоў вёў па радыё праграму «Жывое слова», праз якую даў пуцёўку ў вялікую літаратуру цэламу пакаленню таленавітых творцаў; выдаў пяць кніг апавяданняў для дзяцей, а за мовазнаўчую працу «Слова жывое, роднае, гаваркое...» быў удастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Яго паважалі, ім захапляліся, па адметным дыктарскім голасе пазнавалі на вуліцах і ў крамах.**
**Не так даўно споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Юрэвіча, таму сёння ўспамінамі пра свайго любімага тату з нашымі чытачамі дзеліцца яго дачка Галіна.**

### І ў 80 — малады

— У гады вайны тата працаваў дыктарам на маскоўскім радыё на станцыі «Савецкая Беларусь» і перадаваў навіны на тэрыторыю нашай краіны. Там і пазнаёміўся з мамай, прывёз яе ў Беларусь. Мама часта ўспамінала: прыехалі ў Мінск, выйшлі з цягніка на вакзале, а ўвесь горад у руінах. Восем гадоў яны пражылі ў двары Камітэта радыё на Рэвалюцыйнай, у гаражы. Там жа з ім жылі татавы бацькі, якія хварэлі... Мама таксама ў той час захварэла на туберкулёз...

Але калі я нарадзілася, у сям'і ўжо была кватэра, у доме, дзе кінатэатр «Цэнтральны». Там быў вельмі цікавы асяродак — побач жылі спартсмены, артысты. Дзякуючы тату маё жыццё было багатым і насычаным. Часта браў мяне з сабой на вечарыны, канцэрты, сустрэчы, спектаклі. Вёў адкрытыя канцэрты па радыё, усе яго ведалі, на вуліцах віталіся. У свой час тата быў зоркай, мог і дапамагчы. Напрыклад, паспрыяў таму, каб вядомая актрыса Стэфанія Станюта атрымала кватэру для сына. Але для сябе вельмі рэдка нешта прасіў.

У таты голас амаль да самай смерці заставаўся такім, як у маладосці. Мне часам тэлефанавалі і шторазь па голасе яго прымалі за майго мужа, нават калі бацьку ўжо было 80. Штодзень паласкаў горла, сачыў за голасам. Заўсёды быў акуратны, з прыгожай прычоскай, ветлівы. З усімі. Калі хадзіў на рынак, то прыносіў мноства падарункаў — яго пазнавалі па голасе і імкнуліся нешта падарыць. Мог размаўляць з кім заўгодна на любыя тэмы, яго цікавіла ўсё.

### Па строгім графіку

— Кожную раніцу тата прачынаўся а 6-й, абіраў бульбу і ставіў варыць. Потым рабіў гімнастыку. Пасля вайны ён перажыў інсульт, таму падтрымліваў сябе ў форме, клапаціўся пра здароўе. Ніколі не ўжываў алкаголю. Паснедаўшы ў 9, гадзіны дзве працаваў дома, потым ішоў на работу ў рэдакцыю «Маладосці», вярнуўшыся, яшчэ 20 хвілін спаў, нешта чытаў, праводзіў час з сям'ёй. І вось па такім графіку — кожны дзень.

Тата працуе — гэта святое, дома павінна быць цішыня. Калі я была маленькая і тата працаваў карэспандэнтам «Литературной газеты», ён у Маскву ўсе матэрыялы дыктаваў па тэлефоне. Калі пісаў ці начытваў, я магла падысці да стала, прыхінуцца да таты, ён мяне адной рукой абдымаў, а другой пісаў. Долю сваёй пяшчоты я атрымлівала заўсёды. І ўвечары, як бы тата ні стаміўся, штодзень чытаў мне кнігі, пакуль сама не навучылася. Але як ён чытаў!

У сям'і была атмасфера дабрыні і разумення. Бацька для мяне быў усім, гутарыць з ім можна было пра ўсё. Мы шмат шпацыравалі, ездзілі за горад, і нават цяпер, калі бачу нешта адметнае, хочацца расказаць тату.



Уладзімір Юрэвіч з жонкай Лідзіяй, дачкой Галінай і сынам Леанідам, канец 1950-х гг.

### Кансультант для Мележа

— Тата да ўсіх ставіўся вельмі спакойна і лаяльна. Дахаты цэлыя натоўпы моладзі прыходзілі. Маладыя аўтары заходзілі не проста так: прыносілі новыя творы, хацелі параіцца, пагутарыць. Людзей, званкоў у доме было многа. Быў такі рытуал: калі Іван Мележ нешта новае пісаў, ён тэлефанаваў тату і чытаў. Зачыняліся дзверы ў кабінет, і гутаркі з Мележам доўжыліся гадзінамі. Ён не быў у нас дома, мы не сябравалі сем'ямі. Але я памятаю толькі два разы, як тата плакаў: калі памерла мама, і калі не стала Мележа.

Сем'ямі мы сябравалі з Русецкімі, Бачыламі, ездзілі адзін да аднаго ў госці, вельмі блізка сябравалі з рэдакцыяй «Маладосці». Гэта быў сапраўдны клуб па інтарэсах, супрацоўнікі часопіса часта збіраліся, нешта абмяркоўвалі, нават на адпачынак часам ездзілі разам з сем'ямі.

Да таты часта звярталіся маладыя і сталыя пісьменнікі, каб ён прачытаў іх рукапісы. Будучы вельмі адказным, чытаў усё дасканала, выхоўваў усе абзацы. Гэтым якасці выхаваў і ўва мне. Пры гэтым ніколі не павышаў голасу.

Вельмі плённа і адказна тата працаваў у «Маладосці», дзе быў адказным сакратаром. Чытаў рукапісы, разам з мастаком Янкам Раманоўскім, пляменнікам Янкі Купалы рабіў



Уладзімір Юрэвіч, 1976 г.

макеты нумароў. Выпісваў ганарары і хваляваўся, каб нікога не пакрыўдзіць, усім як мага больш заплаціць. Вельмі крыўдаваў, калі яму былі няўдзячныя. На жаль, такія выпадкі таксама здараліся. Моцна перажываў, хоць нічога не казаў.

### Ад гульні — да клуба

— Тата 40 гадоў вёў на радыё праграму «Жывое слова» — гэта рэкорд параўнальны з рэкордам Гінэса, на жаль, нікім не адзначаны. А пачаў працу ў час, калі беларуская мова не лічылася значнай. Нават мяне ў школе прымушалі адмовіцца ад вывучэння мовы. Я сядзела за адной партай з сынам Аляксея Кулакоўскага, і толькі нам дваім з класа выкладалі беларускую мову.

Спачатку «Жывое слова» было гульнёй, віктарынай, але потым вывучэнне беларускай мовы ў межах праграмы паглыблялася, склаўся цэлы клуб, што аб'яднаў дзяцей, якія любілі пісаць па-беларуску. Вельмі многім з іх тата ад клуба даваў рэкамендацыі для паступлення ў інстытуты, а пазней — для выдання кніг. Сёння многія з «жываслоўцаў» сталі вядомымі ў сваёй галіне людзьмі: пісьменнікі Алесь Бадак, Уладзімір Мазго, Анатоль Бутэвіч, Віктар Шніп, ды і ў цэлым гэтае пакаленне творцаў можа лічыцца выхаванцамі таты. Ён пра іх клапаціўся, як бацька, часта тэлефанаваў, пытаўся пра жонак і дзяцей, пра справы.



З сябрамі клуба «Жывое слова», 1978 г.

Тата любіў сваю краіну і сваю мову. Дадому ён заўсёды прыносіў стосы лістоў, што прыходзілі на радыё, я дапамагала іх чытаць, перабіраць. Не так даўно чарговы раз пераглядала: архіў усё яшчэ захоўваецца ў мяне дома.

### Калі нарадзіўся ўнук

— Татавы кнігі я чытала, і густ літаратурны ў мяне сфарміраваўся дзякуючы яго ўплыву. Мы выпісвалі многія газеты і літаратурныя часопісы, тата ўвесь час чытаў «Звязду», лічыў яе грунтоўным і паважаным выданнем. Я некаторы час займалася фалькларыстыкай, разам з Міхасём Раманюком ездзіла ў экспедыцыі. Вывучала народныя строі. Бацьку гэта вельмі падабалася, ён мной ганарыўся, як і я ганаруся тым, што ў мяне такі тата.

Яго кніга «Слова роднае, жывое, гаваркое...» стала вынікам праграмы «Жывое слова», тата выбраў матэрыялы, якія могуць быць цікавыя для вывучэння. Зараз вельмі прыемна, калі ў праграме «Моўная хвілінка» на радыё спасылаюцца на гэтае выданне. У свой час кніга стала значнай падзеяй, яна вельмі хутка разышлася, у мяне самой ёсць толькі два асобнікі.

Тата пачаў пісаць дзіцячыя кнігі, калі ў яго з'явіўся ўнук Саша, сын майго брата. На мой погляд, яны вельмі добрыя, пазнавальныя, якраз тое, што патрэбна дзецям. Чытачам гэтыя творы таксама вельмі падабаліся, яны часта друкаваліся ў часопісах, на дзіцячых старонках газет, выходзілі асобнымі кнігамі, гучалі на радыё. І сёння татавы творы часта ўключаюць у анталогіі для дзяцей.

**«Быў такі рытуал: калі Іван Мележ нешта новае пісаў, ён тэлефанаваў тату і чытаў. Зачыняліся дзверы ў кабінет, і гутаркі з Мележам доўжыліся гадзінамі».**

Адна з сённяшніх маладосцеўцаў неяк, калі даведалася, што я дачка Юрэвіча, расказала гісторыю, што ў дзяцінстве ёй падарылі кнігу, дзе было апавяданне пра анучку. Яна і цяпер, калі мые падлогу, кожны раз успамінае той татаў твор.

### Розум — аналітычны

— Ён быў вельмі назіральным чалавекам, калі мы ехалі ў лес ці проста гулялі па парку, ніводная дэталь не заставалася без яго ўвагі. Тата доўга абдумваў рукапісы, новыя творы. Меў аналітычны склад розуму, часта сам сабе задаваў пытанне: а чаму? Я таксама сёння часта задумваюся пра некаторыя рэчы і з'явы, пра этымалогію прозвішчаў, але няма ўжо бацькі, каб запытацца, абмеркаваць... Не было такога ў сям'і, што ён садзіў нас з братам і пачынаў расказваць. Ведаў: калі нешта нас цікавіць, мы самі запытаемся.

**«Спачатку «Жывое слова» было гульнёй, віктарынай, але потым вывучэнне беларускай мовы ў межах праграмы паглыблялася, склаўся цэлы клуб, што аб'яднаў дзяцей, якія любілі пісаць па-беларуску».**

Я паступала два разы ва ўніверсітэт, і тата паставіў умову, калі на другі раз не паступлю, то іду на факультэт журналістыкі. Я заўсёды вельмі добра пісала. Але паступіла, куды планавала, стала мадэльерам-канструктарам. Тата ж хацеў, каб я была мастацтвазнаўцам, але вабіла творчая праца. Мой брат таксама не стаў літаратарам, ён фізік. Мама не працавала, выхоўвала дзяцей.

У нашым сямейным архіве — шмат фотаздымкаў з сустрэч у вёсках, бібліятэках. Тата не любіў фатаграфавацца, але вельмі любіў удзельнічаць у сустрэчах, расказваць, меў патрэбу дзяліцца. Некаторы час спрабаваў выкладаць, але нешта не склалася. Хоць некалькі пакаленняў сям'і былі настаўнікамі. У татавага дзеда вучыўся Янка Купала. У Дубраве Смалявіцкага раёна, дзе нарадзіўся, яго бацькі пабудавалі школу. На жаль, у час вайны яна згарэла, але ў пасляваенныя гады быў знойдзены фундамент, на якім мой тата, калі быў маленькі, каменьчыкамі выклаў «Юрэвіч».

***

...Галіна Уладзіміраўна распавядае, што яе тата вельмі любіў палявыя кветкі, таму на яго магілу дачка ўлетку прыносіць валошкі і рамонкі. Ды і помнік на ёй стаіць якраз такі, як хацеў сам Уладзімір Міхайлавіч — валун з яго радзімы, Смалявіччыны, апрацаваны так, нібыта ён абдымае помнік жонкі, пахаванай побач. Ён яе вельмі моцна кахаў... На жаль, гэты валун — пакуль адзіны памятны знак, што нагадвае пра выдатнага чалавека, які так шмат зрабіў для развіцця беларускай мовы і літаратуры, усё сваё жыццё прысвяціў служэнню роднаму слову. На яго доме ўсё яшчэ няма памятнай дошкі, ды і легендарная кніга «Слова жывое, роднае, гаваркое...», перавыдадзеная сёння, стала б своеасаблівым напамінам пра творцу. Яшчэ чакае сваіх пільных даследчыкаў і архіў праграмы «Жывое слова».

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

**Фотаздымкі з сямейнага архіва Галіны Юрэвіч**

■



З паэтам Алесем Бачылам у рэдакцыі часопіса «Маладосць», 1970 г.